22. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею: в 15 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1863–1892. – Т. 2. – 1865. – 301 с.

23. НГАБ у Гродна. – Фонд 1621: Брэсцкая ўніяцкая кансісторыя. – Воп. 5. – Спр. 4: Інвентарныя апісанні манастыроў Ляшчынскага базыльянскага мужчынскага за 1802 г., Навагрудскага базыльянскага жаночага за 1819 г. – 16 арк. Арк. 9.

24. *Слюнькова, И. Н.* Монастыри восточной и западной традиций: Наследие архитектуры Беларуси / И. Н. Слюнькова. – М.: Прогресс-Традиция, 2002. – 600 с.

25. *Суша, А. А.* Отношения между иезуитами и базилианами Великого Княжества Литовского в сфере образования / А. А. Суша // Jėzuitai Lietuvoje (1608–2008): gyvenimas, veikla, paveldas = Jesuits in Lithuania (1608–2008): Life, Work, Heritage / sudarytoja N. Markauskaitė. – Vilnius: Lietuvos nacionalinis muziejus, 2012. – P. 232–244.

26. *Lulewicz, H. P*rotasowicz (Protasewicz) Jan / H. Lulewicz // Polski Słownik biograficzny. – T. XXVIII. – Warszawa-Kraków: Wyd. PAN, 1984–1985. – S. 521–522.

**(Дата падачы: 12.12.2016 г.)**

*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

*I. Sorokovik*
Academy of public administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 378.4(091)(476-25)**

# МІНСКІ ЮРЫДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ: 1944/1945 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

# MINSK LAW INSTITUTE: 1944/1945 ACADEMIC YEAR

*Артыкул прысвечаны аднаўленню працы Мінскага юрыдычнага інстытута ў 1944 г. Тэма практычна не даследавана гістарычнай навукай. Падрыхтаваны на аснове архіўных матэрыялаў, упершыню ўведзеных ў навуковы зварот.*

*Ключавыя словы: Мінск; юрыспрудэнцыя; інстытут; аднаўленне; студэнты; вучэбны працэс; кафедра; выкладанне; дысцыпліны; навуковая дзейнасць.*

*The article is devoted to reconstruction of the Minsk law Institute in 1944. The theme almost not studied by historical science. Prepared on the basis of archival materials, first introduced in the scientific bypass.*

*Key words: Minsk; law; Institute; recovery; students; educational process; Department; teaching; disciplines; scientific research.*

3 ліпеня 1944 г. была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў сталіца Беларускай ССР г. Мінск і ў гэтым жа месяцы пачалася падрыхтоўчая праца па аднаўленні дзейнасці юрыдычнага інстытута ў горадзе – аднаго з першых у рэспубліцы. Гэта сведчыць аб той вялікай увазе вышэйшага саюзнага і рэспубліканскага кіраўніцтва да падрыхтоўкі юрыдычных кадраў.

Перш чым прыступіць да разгляду азначанай тэмы, неабходна спыніцца на пытанні назвы гэтай юрыдычнай установы: у розных выданнях яна вызначаецца па-рознаму. У Беларускай энцыклапедыі ў 18 тамах значыцца, што Мінскі юрыдычны інстытут (далей – МЮІ) як вышэйшая навучальная ўстанова існаваў у 1931–1954 гг. у Мінску. Заснаваны на базе факультэта савецкага будаўніцтва і права (з 1930 г.), які вылучыўся з факультэта права і гаспадаркі (з 1925 г.) БДУ. Да 1932 г. называўся Мінскі інстытут савецкага будаўніцтва і права. Выдаваліся «Працы», «Вучоныя запіскі». У 1954 г. у МЮІ навучалася 2200 чалавек, працавала каля 70 выкладчыкаў. У 1954 г. пераўтвораны ў юрыдычны факультэт БДУ [1, с. 454]. Гэта інфармацыя поўнасцю супадае з матэрыялам 1973 г. М. І. Красоўскага пра Мінскі юрыдычны інстытут [2, с. 252].

7 ліпеня 1931 г. СНК БССР прыняў пастанову «Пра рэарганізацыю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту». На яго аснове быў утвораны Інстытут савецкага будаўніцтва і права пры Прэзідыуме ЦВК БССР [3]. 26 лютага 1933 г. ЦВК БССР рэарганізаваў яго ў Інстытут савецкага права Наркамата юстыцыі рэспублікі [4, арк. 126 аб.].

5 сакавіка 1935 г. ЦВК і СНК СССР прынялі пастанову «О мероприятиях по развертыванию и улучшению правового образования», якая прадугледжвала перайменаванне існуючых інстытутаў савецкага права ў прававыя інстытуты, у тым ліку і ў Мінску [5, ст. 99]. У справе аддзела школ і навукі ЦК КПБ маецца сведчанне пра тое, што па стану на 1 кастрычніка 1935 г. значыўся Інстытут права НКЮ, які размяшчаўся ва ўніверсітэцкім гарадку [6, арк. 18].

У вопісу № 3 фонда НКЮ БССР маюцца некалькі копій дыпломаў выпускнікоў аб атрыманні імі юрыдычнай адукацыі. Яны сведчаць аб тым, што ў дыпломе № 36 ад 30 ліпеня 1938 г. на імя С. А. Гухман значацца наступныя назвы ВНУ: Беларускі дзяржаўны прававы інстытут, Беларускі юрыдычны інстытут, Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут [7, арк. 3]. У гэтым дакуменце звяртае на сябе ўвагу тое, што інстытут названы па-рознаму, але паўсюль першае слова значыцца менавіта «Беларускі», а не «Мінскі». Уяўляецца, што ў той час не звярталі асаблівай увагі на поўную афіцыйную назву ўстановы, усім было зразумела, пра што ідзе гаворка. Тым больш, што гэта былі годы рэпрэсій. Аднак для будучых пакаленняў такая недакладнасць можа прывесці, і часам прыводзіла, да непаразумення, пра які суб’ект права ідзе размова.

З копіі дыплома № 36/166 ад 30 чэрвеня 1940 г. бачна, што Траян Ніна Іванаўна ў 1936 г. паступіла і ў 1940 г. закончыла поўны курс Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута [7, арк. 2]. Значыць, да лета 1940 г. існавала менавіта такая назва. Аднак з пастановы калегіі НКЮ БССР «Аб падрыхтоўцы да новага набору ў юрыдычныя навучальныя ўстановы Наркамата юстыцыі на 1941/42 навучальны год» упершыню ўпамінаецца назва «Мінскі юрыдычны інстытут» [8, арк. 95].

Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў ужо 15 ліпеня 1944 г. у Мінск прыбыў у камандзіроўку начальнік аддзела ваеннай падрыхтоўкі Упраўлення вучэбных устаноў Наркамата юстыцыі СССР гвардыі маёр С. Доўнар з мэтай высвятлення становішча юрыдычных вучэбных устаноў Беларусі. Да вайны ўсе яны знаходзіліся ў Мінску. Гэта Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут, які меў вучэбныя памяшканні, неабходнае абсталяванне, бібліятэку, сталовую, інтэрнат; двухгадовая юрыдычная школа з поўным абсталяваннем, з бібліятэкай і інтэрнатам, а таксама Навукова-даследчы інстытут крыміналістыкі, поўнасцю абсталяваны ўсім неабходным, меў сваю бібліятэку, а таксама выдаваў свае навуковыя працы. Аднак фашысцкімі захопнікамі было амаль усё знішчана.

Па заключэнні С. Доўнара на імя кіраўніцтва НКЮ СССР, для аднаўлення працы юрыдычных вучэбных устаноў Беларусі неабходна было: выдзеліць кніжны фонд за лік іншых юрыдычных вучэбных устаноў Саюза ССР; 2 пішучыя машынкі, 2 т пішучай паперы, карандашоў, ручак, пер'яў, 3 тыс. сшыткаў агульных і вучнёўскіх; фонд для набыцця пасцельных прыналежнасцяў; кухоннае і сталовае абсталяванне для студэнцкай сталовай на 300 чалавек; распрацаваць і зацвердзіць штаты Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута на 1944/1945 навуч. год; тэрмінова прызначыць і адкамандыраваць у Мінск дырэктара Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута, а таксама неабходны для працы прафесарска-выкладчыцкі склад [9, арк. 1, 7].

Высновы С. Доўнара пасля прапрацоўкі ў саюзным Наркамаце юстыцыі далі станоўчы вынік. 29 верасня 1944 г. згодна з распараджэннем Савета народных камісараў СССР за № 19238-р, а таксама аб'яднаным загадам Усесаюзнага камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР і НКЮ СССР ад 5 кастрычніка 1944 г. за № 486/47 у г. Мінску павінен аднавіць сваю працу Мінскі юрыдычны інстытут НКЮ БССР. Дзеля хутчэйшага наладжвання яго працы наркам юстыцыі СССР Н. Рычкоў 16 кастрычніка 1944 г. накіраваў намесніку старшыні СНК СССР В.М. Молатаву просьбу даць указанне Дзяржплану СССР запланаваць на IV квартал водпуск будаўнічых матэрыялаў і абсталявання Наркамату юстыцыі БССР для Мінскага юрыдычнага інстытута [9, арк. 7].

Яшчэ да гэтых актаў СНК БССР 20 верасня 1944 г. прыняў пастанову № 594 «О возобновлении деятельности Белорусского государственного юридического института в г. Минске» за подпісам намесніка старшыні СНК А. С. Шаўрова. Заняткі павінны былі пачацца з 1 кастрычніка 1944 г. План набору на першы курс быў вызначаны ў 150 чалавек. Для інтэрната студэнтаў інстытута былі выдзелены дамы № 33 і 35 па вул. Заслаўскай, а таксама № 23а па вул. Рэвалюцыйнай, якія раней належалі вучэбнай установе. Адначасова Наркамату гандлю БССР ставілася задача ўнесці ў план забеспячэння прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкі склад з 1 кастрычніка 1944 г. [10, арк. 1].

На 20 лістапада 1944 г. першым пасляваенным дырэктарам Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута з'яўляўся С. Доўнар, які арганізацыйна падрыхтоўваў базу для яго адкрыцця [9, арк. 12]. Затым яго змяніў дацэнт І. С. Андрэйчык, які быў накіраваны НКЮ СССР [11, арк. 1].

10 кастрычніка 1944 г. Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут абвясціў прыём студэнтаў на 1944/1945 навучальны год на І–ІІІ курсы. Тэрмін навучання ўстанаўліваўся ў 4 гады. Паступаючыя павінны былі здаваць уступныя экзамены па гісторыі народаў СССР, Канстытуцыі СССР, рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), беларускую мову і геаграфію [11, арк. 9]. Адначасова інстытут арганізаваў падрыхтоўчыя курсы на 70 чалавек [12, арк. 30].

Па стану на 14 лістапада 1944 г. на 1-м курсе лічыўся 151 чалавек, на 2-м – 20, на 3-м – 17. Усяго 188 студэнтаў, а па плану павінна было быць 240. З 188 чалавек 7 з'яўляліся членамі ВКП(б) і кандыдатамі ў члены ВКП(б); 53 – члены ВЛКСМ; 24 – інваліды Вялікай Айчыннай вайны, 19 – партызаны; па нацыянальнаму складу: 139 – беларусаў, 26 – яўрэяў, 23 – рускіх.

Ва ўмовах працягвання Другой сусветнай вайны, разрухі, асабліва ў сталіцы Беларусі, раскіданасці з-за гэтага ранейшых кадраў інстытута па розных франтах, а таксама па розных рэгіёнах краіны ў выніку эвакуацыі аб'ектыўна існавала праблема з прафесарска-выкладчыцкім складам. На 1 студзеня 1945 г. працвала толькі 2 загадчыка кафедр, 2 дацэнты кафедры, 5 старшых выкладчыкаў [12, арк. 1].

У адпаведнасці з загадам наркама юстыцыі СССР яшчэ ад 26 жніўня 1944 г. адкамандзіроўваліся на пастаянную навукова-педагагічную працу ў МЮІ дацэнт Казанскага юрыдычнага інстытута І. С. Андрэйчык, дацэнт Алма-Ацінскага юрыдычнага інстытута Ф. І. Гаўзе, дацэнт, судовы работнік г. Фрунзе М. Ц. Баран, дацэнт, кандыдат эканамічных навук, супрацоўнік Куйбышаўскай юрыдычнай школы В. П. Юдзін. Гэтым жа загадам дырэктар Маскоўскага юрыдычнага інстытута І. І. Шэламагін абавязаны быў выдзеліць МЮІ 5 тыс. экз. вучэбнай літаратуры, у тым ліку 2 камплекты вучэбнікаў. Для патрэб інстытута выдзялялася і адна грузавая машына [11, арк. 1].

Першыя дні і месяцы аднаўлення інстытута былі самымі цяжкімі і складанымі. Прыходзілася ўсё пачынаць з нуля. Да вайны ён меў спецыяльны трохпавярховы будынак, у якім размяшчаліся вучэбныя аудыторыі, навукова-вучэбныя кабінеты, бібліятэка, чытальны зал, службовыя памяшканні. Меліся свае сталовая і інтэрнаты. Апрача апошніх, усё было спалена немцамі. У адным з чатырох інтэрнатаў па вул. Кірава, 49 і размясціўся інстытут.

Для прымальных умоў працы інстытуту тэрмінова патрэбны былі вучэбны корпус, інтэрнат на 150 чалавек; 2 жыллёвыя баракі для мінімум 5 кватэр для выкладчыкаў і жыллё для 80 студэнтаў; аўтатранспарт [12, арк. 28]. Вучэбныя кабінеты не маглі быць арганізаваны. Бібліятэчнага фонду не ме-

лася. НКЮ СССР змог перадаць толькі невялікую бібліятэку ліквідаванай Калінінскай юрыдычнай школы. Маскоўскі юрыдычны інстытут замест 5 тыс. кніг са сваіх кнігасховішчаў выдзеліў толькі 2 тыс., у асноўным брашуры. Ленінградскі юрыдычны інстытут нічога не перадаў. Інстытут меў толькі 5 экз. кароткага курса гісторыі ВКП(б), 2 экз. вучэбніка па тэорыі дзяржавы і права, 12 – па гісторыі дзяржавы і права СССР прафесара Юшкова, 3 – па грамадзянскаму праву. І ўсё гэта на 188 студэнтаў, якія пачалі вучобу пры адсутнасці ў многіх агульных і вучнёўскіх сшыткаў. Веды прыходзілася атрымоўваць толькі непасрэдна на лекцыях і семінарскіх занятках.

Для абсталявання аудыторый удалося набыць у Мінскай папраўча-працоўнай калоніі 50 прымітыўных сталоў на крэставінах і 150 табурэтак. У сувязі з тым, што паліва не мелася і таму вучэбныя аўдыторыі і інтэрнаты цэнтралізавана не атапліваліся, з наступленнем маразоў у ход пайшлі сталы і табурэткі. Да сакавіка 1945 г. іх ужо не стала, і студэнты слухалі лекцыі стоячы. Выкладчыкі і студэнты імкнуліся, наколькі хапала часу, а галоўнае – матэрыялаў, аднавіць тое, што можна было, сваімі сіламі. Адной з невялікіх перамог стала аднаўленне разбуранага будынка гаража інстытута і пераабсталяванне яго пад інтэрнат на 85 чалавек [12, арк. 28].

Рэальна прыступілі да працы дацэнт І. С. Андрэйчык, які стаў выкладаць грамадзянскае права і грамадзянскі працэс, дацэнт Мірон Цолкавіч Баран – палітычную эканомію і асновы марксізму-ленінізму, дацэнт В. П. Юдзін – крыміналістыку, некваліфікаваны выкладчык Злавінскі – гісторыю дзяржавы і права СССР. У другім паўгоддзі 1944/1945 н. г. прыступіў да працы дацэнт Лазар Абрамавіч Рудзіцкі. Ён стаў чытаць курс па тэорыі дзяржавы і права. Да ўсіх відаў заняткаў па крымінальнаму праву і крымінальнаму працэсу, адміністрацыйнаму праву і працоўнаму праву былі прыцягнуты практычныя работнікі органаў суда і пракуратуры г. Мінска. З цягам часу да выкладання розных дысцыплін былі прыцягнуты Рахіль Заліманаўна Ханіна, Рыгор Адамавіч Левін, Галлер Маркавіч Ліўшыц, Любоў Самуілаўна Мінзурэнка, Павел Ісаакавіч Гаўзе, Гаўрыіл Аляксеевіч Павецьеў, Пётр Усцінавіч Грышановіч і інш. [12, арк. 78].

У той жа час інстытуту тэрмінова патрэбны былі высокакваліфікаваныя спецыялісты па агульнай частцы крымінальнага права, дзяржаўнаму праву замежных краін, рымскаму праву, грамадзянскаму працэсу, калгаснаму праву, зямельнаму праву, міжнароднаму публічнаму і міжнароднаму прыватнаму праву. І тут адной з галоўных прычын немагчымасці запрасіць кваліфікаваных выкладчыкаў была адсутнасць жылля для іх.

Нягледзячы на цяжкія ўмовы працы, жыццё ў інстытуце паступова наладжвалася. Загадам наркама юстыцыі рэспублікі І. А. Падута ад 24 студзеня 1945 г. за № 8 быў зацверджаны Вучоны савет Мінскага юрыдычнага інстытута. Ён складаўся са старшыні, якім быў прызначаны дацэнт І. С. Андрэйчык як дырэктар інстытута, намеснікам – дацэнт

М. Ц. Баран, намеснік дырэктара па вучэбнай і навуковай частцы, а членамі савета – Г. М. Базіленка, намеснік наркама юстыцыі БССР па кадрах, а таксама Г. М. Ліўшыц, В. П. Юдзін, Адаменка, Лабнін, Л. А. Рудзіцкі [11, арк. 33].

Вучоны савет на сваіх пасяджэннях разглядаў, як правіла, бягучыя наспелыя пытанні наладжвання працы вучэбнай установы: якасць ведаў студэнтаў, працу выкладчыкаў, вучэбныя планы і праграмы і інш. Да слова, традыцыйныя пытанні, якія па форме разглядаюцца на вучоных саветах ВНУ і сёння, толькі з улікам часу і новых патрабаванняў. На адным з такіх пасяджэнняў у сакавіку 1945 г., пра што сведчыць пратакол № 2, разглядалася пытанне аб паспяховасці студэнтаў. Было адзначана, што першая экзаменацыйная сесія выявіла ў асноўным станоўчыя веды па пройдзеных дысцыплінах. Адначасова зазначана, што многія студэнты дабылі неабходныя для экзаменаў веды не ў парадку сістэматычнай працы над сабою, а ў парадку «штурмаўшчыны» ў апошнія тыдні напярэдадні экзаменаў. Таму член савета Г. М. Ліўшыц не пагадзіўся з дырэкцыяй інстытута, якая на аснове працэнта адзнак па якасці судзіць аб паспяховасці па таму ці іншаму курсу. Гэтым яна арыентуе выкладчыкаў, па выснове Ліўшыца, выстаўляць толькі добрыя адзнакі. Тым самым парушаецца прынцып аб’ектыўнасці. Ён прапанаваў змяніць такі падыход [12, арк. 60].

Дзяржава імкнулася падтрымліваць стымул студэнтаў да здабычы ведаў. З гэтай мэтай, як адна з формаў такога падыходу, было аднаўленне прысваення іменных стыпендый. 8 сакавіка 1945 г. Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР выдаў загад № 102 у адпаведнасці з пастановай Саўнаркама СССР ад 28 лютага 1945 г. за № 379 «Об изменении размеров именных стипендий». Згодна з ім з 1 лютага 1945 г. у цывільных вышэйшых навучальных установах, у тым ліку і Беларускай ССР, павялічваліся імянныя стыпендыі імя Сталіна з 500 да 700 руб. у месяц, імя Молатава, імя Калініна і імя Варашылава – з 400 да 500 руб. кожная, імя Кірава – з 300 да 500 руб. у месяц.

Загадам Наркамюста БССР ад 15 мая 1945 г. для студэнтаў-выдатнікаў Мінскага юрыдычнага інстытута аднаўляліся дзве стыпендыі імя тав. Сталіна, якія існавалі да Вялікай Айчыннай вайны [11, арк. 154, 45]. Яны былі ўведзены 25 сакавіка 1940 г. на аснове зацверджанага палажэння СНК СССР за № 399 аб парадку прызначэння стыпендыі імя Сталіна. 29 сакавіка 1949 г. загадам па Міністэрству вышэйшай адукацыі СССР за № 386 такая стыпендыя была прызначана студэнту 3-га курса Мінскага юрыдычнага інстытута Бекяшко Сяргею Пятровічу [13, арк. 79].

Першы навучальны год пасля вайны паказаў, што не ўсе з залічаных студэнтаў змаглі займацца на працягу вучэбнага года. Па розных прычынах толькі на І курсе адсеялася 29 чалавек. На ўсіх трох курсах засталося 145 чалавек, з іх: беларусаў – 83, яўрэяў – 42, рускіх – 18, украінцаў – 4, іншых – 2; членаў ВКП(б) і кандыдатаў у члены ВКП(б) – 3, членаў ВЛКСМ – 75 [12, арк. 29–30].

Пасля гібелі І. С. Андрэйчыка пасада выконваючага абавязкі дырэктара інстытута была даручана М. Ц. Барану, які 14 жніўня 1945 г. паведамляў ВКСВШ пры СНК СССР, што ў «текущем году у нас выпуска нет» [12, арк. 37]. У сваю чаргу ВКСВШ пры Саўнаркаме СССР паведаміў прыемную навіну: на ІІІ квартал 1945 г. інстытуту праз органы наркамата гандлю дадзены прамтаварны фонд для атаварвання прамысловых тавар-ных картачак прафесарска-выкладчыцкага складу, аспірантаў і студэнтаў. Памеры ўстанаўліваліся (у тыс. руб.) наступныя: бавоўняныя тканіны (для прафесараў – 5,6; выкладчыкаў – 21,3; студэнтаў – 67), шарсцяныя тканіны (адпаведна 14,5; 16,7; 0), шоўк (адпаведна – 4,2; 5; 0), швейныя вырабы (адпаведна 28,2; 31,4; 268), панчохі і шкарпэткі (адпаведна – 1,5; 1; 20), скураны абутак (адпаведна – 4,7; 13,3; 47), гумавы абутак (толькі для прафесараў – 1), ніткі (толькі для выкладчыкаў – 0,3), трыкатаж (толькі для выкладчыкаў – 3) [11, арк. 56].

Для многіх студэнтаў інстытута важным быў і загад старшыні ВКСВШ пры Саўнаркаме СССР С. Кафтанава ад 11 кастрычніка 1945 г. за № 521 у адпаведнасці з пастановай СНК СССР ад 21 верасня 1945 г. за № 2436 «О мероприятиях по оказанию помощи демобилизованным, семьям погибших воинов, инвалидам Отечественной войны и семьям военнослужащих». У ім было загадана вызваліць ад платы за навучанне ў тэхнікумах і вышэйшых навучальных установах дзяцей ваеннаслужачых радавога, сяржанцкага і старшынскага складу, загінуўшых на франтах Айчыннай вайны, а таксама дзяцей інвалідаў Айчыннай вайны І групы. Адначасова кіраўніцтва тэхнікумаў і ВНУ абавязвалася вярнуць плату за навучанне, унесенае за 1-е паўгоддзе 1945/1946 навучальных гадоў навучэнцамі, пра якіх сказана вышэй [9, арк. 16].

Такім чынам, аднаўленне дзейнасці Мінскага юрыдычнага інстытута пачалося практычна адразу пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. Гэта сведчанне вялікай патрэбнасці Беларусі ў юрыдычных кадрах. Дзяржава прымала ўсе меры па наладжванні вучэбнага працэсу, матэрыяльным забеспячэнні выкладчыкаў і студэнтаў, увядзенні імянных стыпендый, вызваленні ад платы дзяцей ваеннаслужачых радавога, сяржанцкага і старшынскага складу, загінуўшых на франтах Айчыннай вайны, а таксама дзяцей інвалідаў Айчыннай вайны І групы.

З другога семестра 1944/1945 навучальнага гада канчаткова ўсталёўваецца назва «Мінскі юрыдычны інстытут». Характэрна, калі саюзны органы называлі яго так адразу пасля вайны, то вышэйшыя органы БССР імкнуліся падкрэсліць яго беларускі рэспубліканскі статус.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2000. – Т. 10: Малайзія – Мугаджары. – 544 с.

2. *Красоўскі, М. І.* Мінскі юрыдычны інстытут / М. І. Красоўскі // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск: Беларус. Сав. энцыкл., 1973. – Т. 7. Манцякі – Паддубічы. – 608 с.

3. ЗЗ БССР. – 1931. – № 32. – Арт. 215.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 265. – Воп. 1. – Спр. 3539.
5. СЗ СССР. – 1935. – № 13.
6. НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 1. – Спр. 8917.
7. Там жа. – Ф. 99. – Воп. 3. – Спр. 160.
8. Там жа. – Воп. 2. – Спр. 793.
9. Там жа. – Фонд 1110. – Воп. 1. – Спр. 3.
10. Там жа. – Спр. 1.
11. Там жа. – Спр. 5.
12. Там жа. – Спр. 2.
13. Там жа. – Спр. 44.

**(Дата падачы: 18.01.2017 г.)**

*Л. Н. Семенова*
Белорусский национальный технический университет, Минск

*L. Semenova*
Belarusian National Technical Universitety, Minsk

**УДК (9)(410)329(091)**

## ЛЕГАЛИЗАЦИЯ БРИТАНСКИХ ТРЕД-ЮНИОНОВ В XIX ВЕКЕ

## LEGALIZATION OF THE BRITISH TRADE-UNIONS AT THE XIX CENTURY

*Жесткое противостояние между верхами и низами английского общества проявилось и во взаимоотношениях государства и тред-юнионизма в XIX в. Первоначально в ранний период формирования профсоюзного движения государство запретило рабочие коалиции. Затем под напором радикального рабочего движения вынуждено было их разрешить. Цеховой юнионизм, объединенный в Британский конгресс тред-юнионов (БКТ), защищая экономические интересы своих членов, разработал программу легализации профсоюзов. Борьба за ее выполнение увенчалась принятием законов 1871 и 1875 гг., определивших правовое положение тред-юнионов.*

*Ключевые слова: тред-юнионизм; рабочее движение; цеховой юнионизм; легализация профсоюзов; юридическое лицо.*

*The cruel opposition between the highest and lower classes of the English society became apparent in the interaction between the state and trade unionism at the XIX century. At the first time in the early period of the making of trade unionism movement the English state rejected the labor coalitions. Then under the pressure of radical labor movement the state permitted the labor coalitions. The shop unionism, united in the British Trade Union Congress (TUC), defending the economic interests of their members, put forward the legalization of trade unions program. The Bills of 1871 and 1875 years became results of the struggle for realization of this program. These Bills determined the legal status of trade unions.*

*Key words: trade unionism; labor movement; shop unionism; legalization of trade unions; juridical person.*